раманаў С. Пясецкага, у тым ліку «Менскай трылогіі», сярод сучаснага чытача. Прычым калі нядаўна вернутыя творы напаўзабытых ці забароненых у савецкія часы пісьменнікаў цікавяць пераважна спецыялістаў-філолагаў, то раманы Сяргея Пясецкага можна прапаноўваць шырокай масавай аўдыторыі.

**П. В. Васючэнка**

## МАСТАЦКІЯ АДКРЫЦЦІ ЯДВІГІНА Ш. НА ФОНЕ ЛІТАРАТУРНАГА ПРАЦЭСУ Ў XX ст.

Ядвігін Ш. (Антон Іванавіч Лявіцкі, 1869–1922) належыць да кагорты беларускіх пісьменнікаў, якія на пачатку XX ст. аб'ядналіся вакол газеты «Наша ніва» (выходзіла з 1906 па 1915 г.) і стварылі энергетычнае поле беларускага культурнага і нацыянальнага Адраджэння. Яно адбылося дзякуючы творчым высілкам такіх класікаў нацыянальнай літаратуры, як Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Алесь Гарун, Максім Гарэцкі, Цётка, Змітрок Бядуля ды іншыя.

Ядвігін Ш. быў нашмат старэйшы за Янку Купалу і Якуба Коласа і мог бы лічыцца патрыярхам беларускага Адраджэння, але не лічыў патрэбным вылучацца на фоне маладых і старанна цягнуў сваю ношку руціннай рэдакцыйнай працы. Хаця і раней за іх адчуў сябе беларусам і беларускім пісьменнікам. Яшчэ ён быў вучнем Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, і гэта значыла, што ён стаўся пасярэднікам паміж напаўлегальнай беларускай літаратурай XIX і літаратурай XX стагоддзя.

У біяграфіі будучага пісьменіка былі бурныя моманты. Ён удзельнічаў у студэнцкіх хваляваннях пасля забойства цара Аляксандра I, быў зняволены. Турэмныя ўражанні апісаны ва «Успамінах» (Вільня, 1921). Студэнт у турме, якім яго паказвае Ядвігін Ш., нагадвае шкаляра з беларускіх інтэрмедый, гарэзлівага, аторву, містыфікатара. Турэмны дзённік, створаны Ядвігіным Ш., як бы прадбачыць аналагічныя творы Якуба Коласа, Францішка Аляхновіча, Кузьмы Чорнага, Паўліны Мядзёлкі, Барыса Мікуліча і іншых беларускіх літаратараў, якія зведалі горыч зняволення. У сусветнай літаратуры турэмныя ўніверсітэты прайшлі такія выбітныя яе прадстаўнікі, як Фёдар Дастаеўскі, Уладзімір Маякоўскі, Оскар Уайльд, Мігель Анхель Астурыяс і шмат хто яшчэ.

У творах Ядвігіна Ш., напісаных ім у нашаніўскі перыяд, важна прасачыць асаблівасці яго творчай эвалюцыі як празаіка. У параўнанні з беларускай паэзіяй, якая ўжо ў XIX ст. была досыць развітай, проза ў нас рухалася нясмелымі і няспешнымі крокамі. Яна вагалася паміж казачным фальклорам і рэальнасцю, вымыслам і явай, што заўважаецца і ў творчасці Ядвігіна Ш.

Анекдатычныя сюжэты ранніх апавядаў Ядвігіна Ш ствárала само жыццё. Часам ён працаваў у тэхніцы нон-фікшн, паказваючы не прыдуманыя, а падгледжаныя ў жыцці гісторыі (апавед «Суд»). Ва ўмовах паскоранага развіцця літаратуры пісьменнік рэтрансляваў вопыт XIX ст. ў будучае – XX стагоддзе.

У сюжэтную прастору прозы Ядвігіна Ш. урываецца жанчына. Разам з ёю ўзнікае комплекс праблем, асабістых, побытавых, сямейных, інтымных, якія сёння абагульняюць паняццем «гендар». Пісьменнік неўзаметку пераходзіць ад фальклорных рэалій да сучасных.

Хатняя вайна свякрухі і нявесткі – сюжэт, дастаткова пашыраны ў сямейна-бытавых казках, народных песнях і ў рэальным жыцці. Яе перыпетыі з гумарам пераказвае Ядвігін Ш. у апавяданні «Важная хвіга».

Няшмат радасці ў жаночай долі, якую апісаў Ядвігін Ш. у сваёй гендарнай прозе. Яго гераіня выходзіць з фальклорнага хранатопа і пачынае жыць у жорсткай яве XX стагоддзя. Яна пакідае вёску, перабіраецца ў горад, але тут яе чакаюць нястача, прыніжэнні, прастытуцыя (апавяданне «Зарабляюць»).

Жыццё маладзіцы ў новай сям'і пададзена ў мінорных танах у апавяданні «Бярозка». Ніхто не паспачувае нядолі Марыські ў сям'і мужа, і яна перадае свае крыўды бярозцы, як навучыў яе бацька. Ад горкіх слёз, пралітых над дрэўцам, бярозка ўсыхае…

Ганула Тамашыха з апавядання «Гаротная» за ўсё сваё жыццё не зведала ніводнай шчаслівай хвіліны. Горкім было яе жыццё да замужжа, яшчэ горшым стала, калі пайшла яна замуж за п'яніцу Тамаша Канцавога. «Не дзеля таго аслабела яна, што галодная была або што Тамаш праз колькі-то год духі выймаў – біў яе – гэта што – глупства; вось другі год ужо як не б'е: зваліўся п'яны з рыштавання, захварэў і памёр, а ўсё ж такі сілы не варочаюцца, – сну зусім няма з таго часу, як увалілася хвароба ў хату». Паміраюць трое сыноў Тамашыхі, цяжка хварэе апошні сынок Сцяпанка. Як нараіла ваража́бітка, Ганула ставіць у печ гаршчок з зеллем, зачыняе ў хаце дзверы і вокны… Сцяпанка, апошняя яе надзея, памірае ад чаду.

А лёс гераіні апавядання «Шчаслівая» зусім не зайздросны. Тадора ўсё жыццё зберагала гаршчэчак, дзе, як пераконваў яе муж Юрка, знаходзіўся скарб яго бацькі. Гаршчэчак, у якім штосьці звінела і шархацела, быў адзінай уцехай у бязрадасным жыцці Тадоры. «Як кот з салам, лётала Юрчыха з гаршком, каб дзе лепш яго захаваць; урэшце ўпіхнула яго сабе пад сяннік». Памірае Тадора «шчаслівай»: «І Тадора заснула, моцна заснула: навекі, а па яе высахшым, забялеўшым твары відаць было, што ўмірала радасная, шчаслівая, – умірала багатая». Юрка дастае з-пад яшчэ не астылага цела жонкі гаршчок, наладаваны гузікамі і газетнымі шматкамі, разбівае яго аб камень.

Чалавечае шчасце, багацце – ілюзіі, гаршчок, запоўнены смеццем. Такая філасофія сталай прозы Ядвігіна Ш., сугучная з філасофіяй экзістэнцыялізму.

Шмат якія апавяданні Ядвігіна Ш. нагадваюць байкі ў прозе, у якіх дзейнічаюць падсвінак, бык, карова, воўк, куры, певень, гусі, індык, варона («Падласенькі», «Рабы», «Дачэсныя», «Варона», «Што сказаў певень», «Вучоны бык»). Яны як бы прадказваюць нараджэнне таго свету, які стварыў у сваіх байках Кандрат Крапіва.

У мастацкім свеце Ядвігіна Ш. ява змешваецца з вымыслам, людзі нагадваюць звяроў, а звяры людзей. Трое вяскоўцаў, што прадавалі дровы ў

горадзе, жадаюць паглядзець на «налпу», а трапляюць на брыдкага і ліхога пана («Заморскі звер»). У апавяданні «Сабачча служба» апісваецца цюцька-правакатар, які заваблівае сваіх сабратаў у пастку да гіцляў.

Фаўна твораў Ядвігіна Ш. прымушае прыгадаць не толькі байкі Кандрата Крапівы, але і раман-антыўтопію Джорджа Оруэла «Ферма».

Іншаказ, прытчавасць былі неад'емнымі рысамі прозы Ядвігіна Ш. і паказвалі на яго блізкасць да філасофіі і эстэтыкі сімвалізму, мадэрнізму, хацеў бы ён таго ці не хацеў.

У апавяданні «Дуб-Дзядуля» сімвалы, створаныя пісьменнікам, набываюць шматзначнасць, ахутваюцца містычным арэолам. Аўтар выяўляе містычную ўзаемасувязь паміж людзьмі, раслінамі, стыхіямі. Герой у сне размаўляе з дубам. Калісьці магутнае дрэва падаецца герою нямоглым старым, які доўга жыў, шмат пабачыў, а сёння просіць толькі пра адно – пра глыток вады. Чалавек выпраўляецца ў трансцэндэнтальнае падарожжа, падчас якога перад ім паўстаюць азёры, напоўненыя потам, слязьмі і кроўю.

Наўпрост да пытанняў пра чалавечую экзістэнцыю Ядвігін Ш. набліжаецца ў апавяданні «З бальнічнага жыцця». Герой твора ўсё жыццё цяжка працаваў, здабываючы свой хлеб, быў бясконца прыніжаны і пакорлівы перад воляй начальства. Перад смерцю ён набывае статус пацыента № 17. Бальнічны наглядчык, штосьці мармычучы сабе пад нос, запісвае ў кніжцы: «1909 года… 23 дня, чорнарабочы 49 лет Сымон скончаўся ў… часоў». Дастае з кішэні гадзіннік, штось падлічвае і запісвае: «часоў 9 вечара». Пацыент № 17 яшчэ жывы, але: «Як увесь свой нядоўгі век быў паслухмяны Сымон, так і ў гадзіну свайго канання астаўся паслухмяным… начальству: у дзевяць сканаў». Недапалак свечкі, якую наглядчык дастае з пальцаў памерлага, – «увесь знак, уся нядоўгая памятка, што на свеце не стала аднаго чалавека».

Твор гэты перагукаецца з п'есай Леаніда Андрэева «Жыццё Чалавека» і навелай Франца Кафки «Пераўтварэнне». Як і з далейшым лёсам самога аўтара.

Апошні ўсплёск творчасці Ядвігіна Ш. – спроба стварыць першы ў беларускай літаратуры раман, які павінен быў выйсці пад назвай «Золата». Пісьменнік не паспеў дапісаць гісторыю кахання Васіля Дубінскага і Зосі Стрончык, паміж якімі непераадольнай перашкодай паўстала багацце. Такім чынам пісьменнік адгадаў матыў будучай раманістыкі, кінематографа, серыяла ў XX – XXI стагоддзяў, дзе на першым плане не чалавек, а грошы, грошы, грошы… Тое, што не паспеў зрабіць Ядвігін Ш., пазней замест яго зробяць Кузьма Чорны, Іван Мележ ды іншыя.

Увосень 1920 г. Ядвігін Ш. прыехаў у Вільню. Выдаў свае «Успаміны» і, як гэта часам здараецца з мемуарыстамі, пражыў няшмат. Памёр на ложку Віленскага шпіталя 24 лютага 1922 года.

Для нас Ядвігін Ш. – пасярэднік паміж двума літаратурнымі стагоддзямі, якому ёсць што сказаць і ў XXI ст., чалавек-шыфр, спадчына якога да канца не расчытана. Гэта майстар, які ўмеў спалучаць у сваіх творах яву і мрою; прарок, які прадбачыў шлях, якім пойдзе беларуская літаратура пасля нашаніўства.